УДК 947.6+947.45+947.78

# ПРАВАВОЕ АФАРМЛЕННЕ АРГАНІЗАЦЫІ ДЫПЛАМАТЫЧНАЙ СЛУЖБЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І ЯЕ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў 1569 - 1588 гг.

*С.А. ЛАШКЕВІЧ*
***(Беларускі дзяржаўны уніеерсітэт, Мінск)***

*Разглядаецца прававое афармленне дыппаматычнай службы Вялікага княства Літоўскага і яе знешнепалітычнай дзейнасці ў перыяд ад Люблінскай уніі да III Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года. Праводзіцца аналіз важнейшых соймавых пастаноў як Рэчы Паспалітай, так і Вялікага княства, разглядаюцца артыкулы Статута 1588 года, якія прама або ўскосна звязаны з арганізацыяй знешнепалітычнай дзейнасці княства.*

Пасля аб'яднання Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) і Польшчы ў федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую (РП) арганізацыя дыпламатычнай службы Княства і яе знешнепалітычная дзейнасць набыла яскравы характар, што было падмацавана юрыдычна-прававой базай як ВКЛ, так і Рэчы ГІаспалітай. У дадзены перыяд назіраецца адасобленасць знешнепалітычных інтарэсаў Вялікага княства ад інтарэсаў Кароны, якая была абумоўлена рознымі знешнепалітычнымі інтарэсамі.

Люблінская унія прадугледжвала ўзнікненне ў межах Вялікага княства Літоўскага і Польскай Кароны сумеснай федэратыўнай краіны. Відавочна, аднак, што рэчаіснасць унесла карэнныя змены ў яе пастановы. У адзначаны перыяд нельга было гаварыць аб Рэчы Паспалітай як аб адзінай саюзнай дзяржаве абодвух народаў. Яе федэратыўнае адзінства павінны былі падтрымліваць перш за ўсё адзіныя дзяржаўныя інстытуты. Соймы зрывалі, а іншых сумесных для Кароны і Вялікага княства органаў вышэйшай дзяржаўнай улады да апошняй трэці XVIII ст. не існавала. На практыцы толькі ў 70 - 90-я гады XVIII ст. канфедэратыўны саюз Польшчы і Вялікага княства эвалюцыяніраваў у бок федэрацыі.

Акт Люблінскай уніі быў афармлены ў выглядзе прывілея-дагавору. У ім гаварылася, што Каралеўства Польскае і Вялікае княства Літоўскае ўяўляюць сабой ужо адно непадзельнае цэлае, адну агульную рэспубліку, якая злучылася і злілася ў адзін народ з дзвюх дзяржаў і народаў. Яшчэ ўказвалася, што хоць асобнае ўзвядзенне на княжанне вялікага князя літоўскага павінна быць адменена, але тытул і пасады Вялікага княства застаюцца. Уступаючы на прастол, новы кароль пад прысягаю пацвярджае ўсе правы і вольнасці падданых абедзвюх дзяржаў і народаў. Надалей збіраюцца толькі агульныя соймы і адна Рада. Цалкам захоўваюцца правы і прывілеі, а таксама высокія пасады. Дагаворы і саюзы з іншымі краінамі заключаюцца толькі з агульнай згоды абодвух народаў.

Вялікае княства павінна было перастаць існаваць адразу пасля падпісання акта уніі, але далейшы ход палітычных падзей паказаў, што жыццёвыя сілы яго хоць і падарваныя, але не знішчаныя. Баючыся народных паўстанняў на Беларусі і асабліва масавага пераходу насельніцтва ў Расію, польскія феадалы і верхаводы каталіцкай царквы вымушаны былі згадзіцца на захаванне княства як самастойнай дзяржавы, праўда, без Украіны і заходняй часткі Беларусі.

Люблінская унія 1569 года прадугледжвала існаванне адзінай дыпламатычнай службы Рэчы Паспалітай. Дагаворы і саюзы Польшчы і ВКЛ з іншымі краінамі маглі заключацца толькі з агульнай згоды абедзвюх дзяржаў. Між тым узаемаадносіны паміж суб'ектамі федэрацыі заставаліся такімі ж, як і пры персанальных уніях да 1569 г. Існавала адасобленасць урадаў, у тым ліку ведамстваў замежных спраў - дзяржаўных канцылярый.

Юрыдычнае афармленне знешнепалітычнай дзейнасці дыпламатычнай службы Вялікага княства Літоўскага пачалося адразу ж пасля падпісання Люблінскай уніі 1569 года. Гэтаму працэсу спрыяла актыўная дзейнасць буйных магнатаў Княства, якія імкнуліся праз незалежную дыпламатычную службу краіны абараніць свае знешнепалітычныя інтарэсы. Тры «бескаралеўі» у Рэчы Паспалітай у адзначаны перыяд садзейнічалі юрыдычнаму замацаванню арганізацыі дыпламатычнай службы Княства і яе знешнепапітычнай дзейнасці, паколькі ў гэты час актывізавала сваю дзейнасць Рада ВКЛ, якая выступала з пазіцый знешнепалітычнай адасобленасці [16, с. 118].

Прававое становішча караля ў знешнепалітычнай дзейнасці вызначалася агульнадзяржаўнымі актамі - «Пакта канвента» і «Генрыхаўскімі артыкуламі», а ў ВКЛ яшчэ і Статутам 1588 года. «Пакта канвента» ўтрымлівала шэраг абавязкаў, якія былі прапанаваны да падпісання Генрыху Валуа пры абранні яго на каралеўскі прастол у Рэчы Паспалітай у 1573 г. Затым па іх узоры заключаліся пагадненні і з іншымі кандыдатамі на каралеўскі трон. Згодна з «Пакта канвента» Генрых Валуа, стаўшы каралём Рэчы Паспалітай, абавязваўся захоўваць наступныя ўмовы: заключыць вечны саюз Рэчы Паспалітай з Францыяй; у час вайны Францыя абавязана была прыслаць у Польшчу гасконскую пяхоту; у выпадку вайны з

Масквой Генрых Валуа павінен быў выставіць 4 тыс. гасконскай пяхоты і ўтрымліваць іх за свой кошт на працягу паўгода; стварыць за свой кошт флот на Балтыйскім моры. Прадугледжвалася пашырэнне гандлю паміж РП і Францыяй, пацвярджэнне ўсіх правоў і прывілеяў [17, с. 210].

У 1573 годзе на сойме былі выпрацаваны патрабаванні да манарха, якія ўвайшлі ў гісторыю як «Генрыхаўскія артыкулы». Адпаведна «Генрыхаўскім артыкулам» толькі сойм мог прыняць рашэнні, абавязковыя для ўсіх дзяржаўных асоб, па пытаннях, звязаных з аб’яўленнем вайны і мабілізацыяй паспалітага рушэння. Манарх быў пастаўлены пад кантроль Пастаяннага савета з 16 сенатараў-рэзідэнтаў, абіраемых соймам. «Генрыхаўскія артыкулы» абмяжоўвалі манарха ў знешнепалітычнай сферы. Так, кароль не мог без ведама сената прыняць замежныя пасольствы і вывесці войскі за межы дзяржавы.

Радыкальныя прапановы шляхты РП па абмежаванню паўнамоцтваў манарха вызвалі супраціўленне з боку Генрыха Валуа. Толькі пасля яго ад’езду ў Францыю ў 1574 годзе «Генрыхаўскія артыкулы» былі зноў пацверджаны выбраным каралём Стэфанам Баторыям. З гэтага часу «Генрыхаўскія артыкулы» пацвярджаліся ўсімі манархамі. У гэты час за федэрацыяй канчаткова ўсталявалася афіцыйная назва «Рэч Паспалітая». «Генрыхаўскія артыкулы» 1573 года з’явіліся першым заканадаўчым крокам да замацавання страчаных Люблінскай уніяй знешнепалітычных паўнамоцтваў дыпламатычнай службы Вялікага княства Літоўскага.

Паслабленне ўлады манарха павялічыла значнасць агульнадзяржаўнага сойму ў палітычным жыцці РП. Месцам правядзення соймаў стала Варшава. С 1673 года кожны трэці сойм праводзіўся ў Гродна, на тэрыторыі ВКЛ. Вальны сойм мог разглядаць любыя пытанні, якія выносіліся на пасяджэнне каралём альбо сенатам. Выключнай кампетэнцыяй сойма з’яўлялася выбранне манарха, аб’яўленне мабілізацыі войска, збор сродкаў на вядзенне вайны, заключэнне ваенных саюзаў, прыняцце найбольш значных заканадаўчых актаў. Пастанова сойма ўступала ў сілу пры ўмове падтрымкі яе ўсімі членамі. Кожны дэпутат мог выкарыстаць права вета. У XVII стагоддзі кароль РП залежаў яшчэ больш ад волі сойма. Кантроль ажыццяўляўся не толькі за дзяржаўнай дзейнасцю манарха. З 1669 года манарх РП быў пазбаўлены права самастойна пакідаць сваю пасаду.

Пашырэнне кампетэнцыі сойма адлюстравалася і на знешняй палітыцы. У XVI стагоддзі сойм мог выслухаць паслоў замежных краін і абмеркаваць важныя знешнепалітычныя праблемы. У XVII стагоддзі ён атрымаў выключнае права зацвярджаць мірныя дамовы і саюзы, вырашаць пытанні, звязаныя з утварэннем прадстаўніцтваў РП за мяжой і замежных прадстаўніцтваў у РП, удзельнічаць у складанні дыпламатычных дакументаў. Сойм зацвярджаў кандыдатуры паслоў і кантраляваў іх дзейнасць. У 1613 годзе сойм атрымаў права аб’яўляць вайну.

Паміж дыпламатычнымі службамі ВКЛ і Кароны ў 1569 - 1588 гг. канчаткова замацаваўся падзел знешнепалітычных паўнамоцтваў. Да знешнепалітычнай кампетэнцыі канцылярыі Княства належылі дыпламатычныя адносіны з Маскоўскай дзяржавай і часткова са Швецыяй. Адносіны з 'Турцыяй, Крымскім ханствам, Персіяй, Ватыканам, еўрапейскімі дзяржавамі знаходзіліся ў руках Кароны [14, с. 190].

У адзначаны перыяд павышаецца роля вялікага гетмана ВКЛ у дыпламатычных зносінах паміж краінамі. Дадзеная юрыдычная норма была замацавана соймам Рэчы Паспалітай ў 1588 г. Да ўдзелу ў знешнепалітычнай дзейнасці краіны таксама былі прыцягнуты польныя гетманы Княства, а таксама гетман Інфлянтаў.

На знешнепалітычную дзейнасць як ВКЛ, так і Польшчы ў другой палове XVI ст. уплывалі і розныя шляхецкія зборы. Апрача земскіх і павятовых сеймікаў, на ніжэйшым узроўні трэба назваць генеральныя сеймікі. Збіраліся яны ў Коле, Корчыне (Польшча), Ваўкавыску ці Слоніме (Вялікае княства Літоўскае). Праўда, сваё значэнне яны згубілі ў першай палове XVII ст. Даўжэй існавалі генеральныя сеймікі Каралеўскай Прусіі і Мазовіі. Сярод збораў далейшае месца займала так званая Віленская Канвакацыя. Артыкул 16 Люблінскай уніі забараняў асобна склікаць літоўскія і каронныя сеймы. Наперакор гэтаму Віленская канвакацыя збіралася звыш дваццаці разоў, аж да пачатку XVIII ст. Канвакацыя склікалася ў прынцыпе каралём, а ў часы бескаралеўя збіралася стыхійна. У час пасяджэнняў паслы ВКЛ абмяркоўвалі пытанні вайны, ладу і заканадаўства Княства, яго ўзаемаадносінаў з Каронай.

Доўгі час улада канцлера ў канцылярыі была неабмежавана. І толькі на каранацыйным сойме 1574 года шляхта РП выступіла за прыняцце канстытуцыі адносна правоў канцылярыі. Фармальна повадам для гэтага паслужыла барацьба палітычных груповак за пасаду падканцлера канцылярыі Кароны. Пасля зацвяржэння соймам канстытуцыі канцлер страціў права без каралеўскага подпісу выдаваць прывілеі на маёнткі і ўласнасць [9, с. 90].

Інстытут гетманства ВКЛ сюіадаўся з пасад вялікага гетмана і польнага гетмана Княства. У 1566 - 1578 гг. дзейнічала пасада гетмана Інфлянтаў. Гетманы не ўваходзілі ў сенат Рэчы Паспалітай па пасадзе, але паколькі яны спалучалі свае пасады з ваяводскімі ці кашталянскімі, то былі там прадстаўлены. Прымаючы актыўны ўдзел у пасяджэннях агульнадзяржаўнага сената РП, гетманы ўплывалі на выпрацоўку знешнепалітычнай лініі Рэчы Паспалітай на міжнароднай арэне. Акрамя таго, яны ўдзельнічалі ў пасяджэннях Рады ВКЛ, якая была месцам каардынацыі знешняй палітыкі Княства [1, с. 731].

Як адзначае расійскі дарэвалюцыйны гісторык І.І. Лапо, само прызначэнне вялікага гетмана ВКЛ адрознівалася ад прызначэння на іншыя высокія дзяржаўныя пасады. У гой час як на іншыя дзяржаўныя пасады кароль прызначаў, павышаючы іх па службовай лесвіцы, вялікага гетмана ён прасіў прыняць на сябе абавязкі гэтай пасады. Гэта акалічнасць дазваляла яму адстойваць знешнепалітычныя інтарысы Княства, якія істотна адрозніваліся ад інтарэсаў Кароны. Як правіла, пасада вялікага гетмана сумяшчалася з іншымі дзяржаўнымі пасадамі, што станоўча адбівалася на вырашэнні знешнепалітычных задач. Так, Мікалай Юр'евіч Радзівіл сумяшчаў пасаду вялікага гетмана з пасадамі ваяводы віленскага, канцлера ВКЛ і старасты ашмянскага і лідскага. У час Лівонскай вайны (1558 - 1583 гг.) пасада вялікага гетмана стала пажыццёвай [11, с. 522].

У 1588 г. Жыгімонт III зацвердзіў сваім прывілеем Статут Вялікага княства Літоўскага, які ў навуковых працах яшчэ называюць Трэцім Статутам ВКЛ. Статут меў сваімі крыніцамі для распрацоўкі Статуты ВКЛ 1529 і 1566 гадоў, соймавыя пастановы 1573, 1578, 1580 і 1584 гадоў, прывілеі, пастановы павятовых соймікаў. Звод законаў заканадаўча аформіў захаванне Княства як дзяржавы насуперак акту Люблінскай уніі. Складальнікі Статута не ўнеслі ў яго ніводнай нормы, якая б магла быць скарыстана на шкоду дзяржаўнай самастойнасці. Статут быў падрыхтаваны на высокім тэарэтычным узроўні кваліфікаванымі правазнаўцамі, працай якіх кіравалі А.Б. Валовіч і Л.І. Сапега. Яны займалі ў той час адпаведна пасады канцлера і падканцлера Вялікага княства Літоўскага. Статут мае 14 раздзелаў і 488 артыкулаў. У дадзеным Статуце ў І - III разделах змешчаны нормы дзяржаўнага права. Гэтыя раздзелы цікавыя для нас тым, што тут прама альбо ўскосна змешчаны юрыдычныя нормы, якія рэгулююць знешнепалітычную дзейнасць ВКЛ і арганізацыю яе дыпламатычнай службы [15, с. 11].

Раздзел І, артыкул 6 устанаўліваў адказнасць за ўцёкі падданых ВКЛ ў непрыяцельскую зямлю. Вядома, што пад час войнаў з Маскоўскай дзяржавай такія выпадкі былі частымі. У артыкуле 6 змяшчаецца адказнасць, паводле якой збеглы страчвае гонар, а дзеці за такую здраду бацькі аддаляюцца ад яго маёнткаў, якія пераходзяць да каралеўскага двара [15, с. 19].

Раздзел І, артыкул 16 устанаўлівае адказнасць за падробак подпісаў, пячаток як караля Рэчы Паспалітай, так і канцлера, падканцлера альбо пісараў ВКЛ, а таксама выраб фальшывых лістоў. Дадзеная норм дзейнічала пад час напісання дыпламатычных лістоў. У адпаведнасці з правам пры наяўнасці доказаў такі чалавек падлягае смяротнаму пакаранню агнём. А тыя лісты, якія былі падроблены, страчваюць юрыдычную сілу [15, с. 25].

Артыкул 24 першага раздзела ўстанаўлівае адказнасць за знявагу альбо забойства пасланца гаспадарскага альбо align вознага, якія накіроўваюцца з лістамі гаспадарскімі як у іншую краіну, так і ў межах Рэчы ГІаспалітай. Гэтая юрыдычная норма стрымлівала ў значнай ступені напады на купцоў, якія рухаліся разам з пасольствамі. Дадзеная норма, нажаль, распаўсюджвалася і дзейнічала толькі на тэрыторыі Гіольшчы і ВКЛ, паколькі ў тыя часы яшчэ не існавала міждзяржаўных дагавораў аб недатыкальнасці пасла [15, с. 27].

У трэцім раздзеле 1-га артыкула ідзе размова аб недатыкальнасці дзяржаўных межаў ВКЛ, а таксама аб магчымым пашырэнні Княства ў будучым: «Мы, гаспадар, абяцаем таксама і клянёмся аб гэтым за сябе і за патомкаў нашых, вялікіх князёў літоўскіх, пад тою ж прысягай нашай. якую мы далі ўсім абывацелям усіх земляў Вялікага княства Літоўскага, што гэта слаўнае панства Вялікае княства і ўсе землі, што належаць яму з даўніх часоў і цяпер, у славе, тытулах, сталіцы, высакароднасці, уладзе, заможнасці, вяршэнстве і ў іншых усякіх прыналежнасцях і прыслухоўванні, і таксама ў межах, ні ў чым не павінны памяншацца і адрывацца або паніжацца» [15, с. 42].

Артыкул 4 трэцяга раздзела дае абяцанне ў асобе караля Рэчы Паспалітай павялічыць Вялікае княства Літоўскае і адначасова тыя землі, якія былі адабраны, зноў далучыць да Княства: «Таксама ўладанні панства таго Вялікага княства Літоўскага не зменшым, і тое, што было праз непрыяцеляў таго панства аддаленае, забранае і да іншага панства ад таго панства нашага калісці было выпрашанае, то ўсё ва ўласнасць гэтага Вялікага княства вярнуць, далучыць і граніцай выправіць абяцаем. А калі б таксама каму з заграні́чнікаў пры граніцах, тых вышэйназваных, землі, маёнткі, сёлы і людзей далі, тады такія абавязаны з таго служыць Вялікаму княству Літоўскаму. А хто б не хацеў служыць, такіх прывілеяў не павінны мы і патомкі нашы прытрымлівацца». Дадзены артыкул датычыўся як земляў, якія былі страчаны пад час войнаў ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай у XVI ст., так і зямель Княства, далучаных да Польшчы актам ад 5 сакавіка 1569 года. Паводле гэтага акта Падляшская зямля з гарадамі Драгічынам, Мельнікам, Бельскам і іншымі далучалася да Польшчы. Беларускі гісторык *Я.А.* Юхо лічыць, што з юрыдычнага боку акт аб далучэнні зямель Княства да Польшчы быў не законны і належала лічыць, што ён не мае сілы. Дадзены акт супярэчыць параграфам 12 і 15 прывілею 1492 года, артыкулам 1,2, 12 трэцяга раздела Статута 1566 года, а таксама грамаце Жыгімонта Аўгуста ад 21 снежня 1568 года, дзе кароль абяцаў захоўваць старыя законы і звычаі і не парушаць тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. Такім чынам, артыкул 4 Статута 1588 года фактычна з'яўляўся знешнепалітычным актам ВКЛ, які даваў права Княству адстойваць свае правы натэрыторыі адабраныя Польшчай падчас Люблінскай уніі [15, с. 44].

Артыкул 6 гэтага раздзела ўстанаўліваў парадак склікання, фармавання, а наступны, 7 артыкул і парадак фінансавання павятовых соймікаў, а таксама вальнага сойма ВКЛ. У сувязі з гэтым трэба адзначыць, што ў выніку ўнутрыдзяржаўных рэформ у ВКЛ шляхта атрымала рэальную магчымасць уплыву на знешнюю палітыку краіны. Ініцыятарам гэтых рэформаў быў Жыгімонт Аўгуст, кароль Польшчы і вялікі князь Вялікага княства Літоўскага. Такім чынам, соймікі давалі шляхце непасрэдны ўдзел у палітычных справах як знешніх, так і ўнутраных. Юрыдычна правы павятовых соймікаў былі замацаваны ўжо ў другім статуце ВКЛ, дзе было запісана, што мэтай павятовага сойміка з'яўляецца вядзенне ўнутрыпавятовых спраў на месцы, а таксама абарона земляў ад знешняй пагрозы. Сойм павятовы збіраецца па волі караля і вялікага князя. Другі статут не абмяжоўваў прадмет абмяркавання сойма толькі тымі пытаннямі і справамі, якія прапаноўваліся каралём. Сойм мог па асабістай ініцыятыве абмяркоўваць пытанні, пры тым як свайго, павятовага, так і дзяржаўнага характару. Менавіта пад тэты пункт падлягалі пытанні знешняй бяспекі, пагранічных канфліктаў, міждзяржаўнага гандлю і г.д. [15, с. 44].

У артыкуле 8 раздзела III гутарка ішла аб галоўным сойме ВКЛ напярэдадні агульнадзяржаўнага сойма Рэчы Паспалітай. Галоўны сойм ВКЛ павінен быў збірацца ў Слоніме і выпрацоўваць агульную ўнутрыпалітычную і знешнепалітычную пазіцыю лініі шляхты Княства. Дадзеная з'ява давала падставу, скаардынаваўшы свае намаганні, адстаяць знешнепалітычныя інтарэсы ВКЛ [15, с. 45].

Артыкул 12 раздзела III забараняў атрымліваць высокія дзяржаўныя пасады ў Княстве іншаземцам, дарэчы, да іх ліку адносіліся і выходцы з Польшчы. Пасольская служба ВКЛ складалася выключна толькі з жыхароў Княства. Пасольствы ВКЛ, якія накіроўваліся за мяжу, былі сфарміраваны выключна прадстаўнікамі Вялікага княства Літоўскага. На чале канцылярыі стаялі таксама нашы суайчыннікі. Тэта канцлеры: Мікалай Юр'евіч Радзівіл (1566 - 1579), Астафій Валовіч (1579 - 1587), Леў Сапега (1589 - 1623) [15, с. 46].

У артыкуле 16 раздзела III гаварылася аб свабодзе выезду з Княства ў іншыя хрысціянскія дзяржавы, акрамя непрыяцельскіх: «Таксама жадаем і пастанаўляем на векі вечныя, каб княжаты і паны харугоўныя, шляхта і кожны чалавек рыцарскі і ўсякага саслоўя гэтага панства Вялікага княства Літоўскага мелі свабоду і маглі выехаць і выйсці з гэтых земляў нашых Вялікага княства для набыцця навук, у пісьме практыкавання і ўчынкаў рыцарскіх і таксама, маючы слабое здароўе, для лячэнне ва ўсе землі і краіны, акрамя земляў непрыяцеляў нашых, з кім бы тое панства наша на той час ваявала» [15, с. 47].

Артыкул 18 раздзела III называецца: «Аб ненадзяленні годнасцю ўрадаў людзей простага народу». З артыкула вынікае, што просты народ ВКЛ не мае права займаць службовыя пасады. Артыкул цікавы для нас тым, што канцылярскія пасады паводле Статута не павінны былі замацоўвацца за простым людам [15, с. 48].

Артыкул 21 раздзела III рэгламентуе працэс прызнання шляхецкага паходжання іншаземцаў у ВКЛ, калі былі падставы сумнявацца ў яго сапраўднасці: «Таксама калі б якому чужаземцу хто заявіў аб яго нешляхецтве, тады ён павінен ехаць у сваю зямлю, адкуль родам, і там перад урадам даказаць сваё шляхецтва і з урада пад іх пячаткамі ліст прынесці, якім тут шляхецтва сваё павінен даказаць» [15, с. 49].

Статут Княства 1588 года юрыдычна замацаваў адасобленасць знешнепалітычных інтарэсаў краіны ад інтарэсаў Кароны. У дадзеным юрыдычным акце не згадвалася пра унію з Польшчай і адначасова абвяшчалася праграма аднаўлення ранейшых межаў Княства. Статут гарантаваў недатыкальнасць пасла Княства, вызначаў знешнепалітычныя кампетэнцыі караля Рэчы Паспалітай, соймаў і соймікаў Вялікага княства Літоўскага, а таксама гетманаў ВКЛ. Паводле Статута забаранялася запрашаць на дыпламатычную службу іншаземцаў, справаводства ў канцылярыі краіны вялося на старабеларускай мове.

Такім чынам, прававое афармленне дыпламатычнай службы Вялікага княства Літоўскага і яе знешнепалітычнай дзейнасці ад Люблінскай уніі 1569 года і да III Статута 1588 года носіць складаны і па сваёй сутнасці супярэчлівы характар. Супярэчлівасць вынікае з таго, што дыпламатычная служба Княства і яе знешнепалітычная дзейнасць будавалася не толькі на аснове юрыдычных норм, якія разглядаліся ў рамках ВКЛ, але таксама і нормаў, якія зацвярджаліся ў рамках Рэчы Паспалітай. Знешнепалітычная дзейнасць Вялікага княства будавалася на аснове юрыдычных норм, якія зацвярджаліся пастановамі агульнадзяржаўнага сойма РП, прывілеямі караля, пастановамі сойма ВКЛ, а таксама пастановамі павятовых соймікаў. Вялікі ўклад у замацаванне норм знешнепалітычнага характару ўнёс III Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года.

## ЛІТАРАТУРА


1. Historia diplomacji polskiej. T. I / Pod red. Z. Wójcika; Oprać. J. Gierowski. - Warszawa: PWN, 1982. - 775 s.
2. Historia państwa I prawa Polski do roku 1795: W 4 t. / Polska Akademia Nauk; Pod red. J. Bardacha. - Warszawa: PWN, 1966. - T. 2: Od połowy XV wieku do r. 1795 / Z. Kaczmanczyk, B. Lesniowski. - 674 s.
3. Polska służba dyplomatyczna od XVI do XVIII w. - Warszawa, 1966. - 348 s.
4. Wyczanski A. Polska w Ewropie XVI stulecia. - Warszawa, 1973. -256 s.

5. Zelewski R. Służba dyplomatyczna litewska w zestawieniu z koronna // Historia diplomacji polskiej. - Warszawa: PWN, 1982.-T. 1, czesc 7. - S. 786 - 788.
6. Бычкова М.Е. Русское государство и Великое княжество Литовское с конца XV в. до 1569 г. Опыт сравнительно-исторического изучения политического строя. - М., 1996. - 176 с.
7. Закшэўскі А.Б. Юрыдычна-адміністрацыйны рэгіяналізм у 1 Рэчы Паспалітай // Беларусіка - Albaruthenica. Кн. 3. Нацыянальныя і рэлігійныя культуры, іх узаемадзеянне / Рэд. А. Малдзіс і інш. - Мн.: Навука і тэхніка, 1994.-С. 16-23.
8. Книга Посольской Метрики Великого княжества Литовского, содержащая в себе дипломатические сношения Литвы в государствование короля Сигизмунда Августа (с 1545 по 1580 г.) / Изданная по поручению Императорского московского общества истории и древностей российских М. Оболенским и проф. И. Даниловичем. Т. 1,2.- М., 1843.
9. Кулаковский П. Канцелярія руськоі (волинськоі) метрики 1569 - 1673 рр. Студія з історіі українського регіоналізму в Речі Поспалитій. - Острог-Львів, 2002. - 304 с.
10. Лаппо И.И. Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия: Литовско-русский повет и его сеймик. - Юрьев; Тип. К. Маттисена, 1911.- 191 с.
11. Лаппо И.И. Великое княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569 - 1586): Опыт исследования полит, и общест. строя. Т. 1. - СПб.: тип. И.Н. Скороходова, 1901.- 780 с.
12. Радаман А.А. Кіраванне соймікавымі пасяджэннямі ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім у другой палове XVI - пачатку XVII ст. // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. - 2002. - № 2. - С.120 - 129.
13. Салей С.М. Дыпламатычныя адносіны Вялікага Княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай у 30 - 80-я гады XVI стагоддзя: да пастаноўкі асноўных праблем // Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе: Материалы междунар. науч. конф. - Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2002. - С. 74 - 79.
14. Снапкоўскі У.Е. Пра калізіі знешнепалітычных інтарэсаў польскай Кароны і Вялікага Княства ў складзе Рэчы Пасалітай // Спадчына. - 1995. - № 3. - С. 189 - 200.
15. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 / Пер. на бел. мову А.С. Шагун. - Мн: Беларусь, 2002. - 207 с.
16. Шаўцоў Ю. Літоўскі сэпаратызм канца XVI ст. // Спадчына. - 1995. - № 2. - С. 112-136.
17. Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларуси Вучэб. дапамож. - Мн.: Універсітэцкае, 1992.-270 с.